# Не касметычны рамонт, а капітальны

**Будынак ФАПа ў вёсцы Беразцы Пінскага раёна зусім не новы. Тут ніколі раней не было, напрыклад, вады. Яе медработнікі прыносілі з найбліжэйшага калодзежа. Цяпер сельская медыцынская ўстанова перажывае капітальны рамонт і поўнае абнаўленне. Дапамог у гэтым член Савета Рэспублікі.**



— Вясной я звярнулася да нашага **сенатара, дырэктара ААТ «Парахонскае» Уладзіміра ХРАЛЕНКІ** з просьбай дапамагчы зрабіць касметычны рамонт на ФАПе, — гаворыць **загадчыца Парахонскай участковай бальніцы Таццяна ЛАЎРЭНКА**. — Як заўсёды, Уладзімір Фёдаравіч адгукнуўся на просьбу. Былі закуплены фарба, шпалеры, іншыя матэрыялы. У выніку касметычнага рамонту будынак павінен быў пасвяжэць і папрыгажэць. Яшчэ была дамоўленасць падвесці ваду на ФАП, бо вада ў медыцынскай установе — у ліку найпершых патрэб.

Але ў маі, як вядома, у краіне прайшла вялікая нарада па актуальных пытаннях аховы здароўя, на якой кіраўнік дзяржавы асаблівую ўвагу ўдзяліў вёсцы. Было сказана, што не варта праводзіць аптымізацыю агулам, там, дзе ёсць сотня і больш чалавек, ФАПы павінны працаваць. Быў абазначаны і тэрмін навядзення парадку ў дадзенай сферы — да пачатку наступнага года.

Спецыялісты Пінскай цэнтральнай раённай паліклінікі разам з будаўнікамі, архітэктарамі, санітарнай службай і іншымі зацікаўленымі ведамствамі вывучылі стан кожнай сельскай медыцынскай установы, вызначылі фронт работы, які аказаўся надзвычай вялікім. З 39 фельчарска-акушэрскіх пунктаў раёна 36 мелі патрэбу ў рамонце, некаторыя трэба было пераносіць у іншыя памяшканні. Калі дайшла чарга да вырашэння лёсу Беразцоўскага ФАПа, як заўсёды, сенатар Храленка не застаўся ўбаку. Было прынята рашэнне правесці капітальны рамонт будынка, аб'яднаўшы намаганні цэнтральнай паліклінікі і ААТ «Парахонскае».

— Цяпер актыўна вядзецца работа, — расказвае **фельчарка Беразцоўскага ФАПа Алеся АСІПЕНКА**. — Наш фельчарска-акушэрскі пункт — адзін з самых аддаленых у раёне, да Пінска ад вёскі — добрыя 50 кіламетраў. Да Парахонска, найбліжэйшай медустановы, адлегласць складае 25 кіламетраў, аўтобус ходзіць тры разы на тыдзень. Са 160 чалавек, жыхароў дзвюх вёсак — Беразцы і Маладзельчыцы, якія прыпісаныя да ФАПа, большасць складаюць пажылыя людзі. Для іх медыцынская дапамога асабліва актуальная. Мы не маглі дазволіць сабе закрыць ФАП нават на кароткі час рамонту. Таму работа ўстановы сумяшчаецца з рамонтам, які вядзецца паэтапна. Працуе будаўнічая брыгада ААТ «Парахонскае».

Прыемна бачыць, як наша медыцынская ўстанова ператвараецца на вачах, — працягвае спецыялістка. — Ужо заменены вокны і дзверы, кладзецца новая падлога, з'явіўся новы дах, вядуцца работы па адстройванні. Паколькі будынак стары, блочны, спецыялісты прызналі, што электрычнага ацяплення будзе мала. Таму вырашана пакінуць печкі, толькі падрамантаваць іх, а яшчэ ўстанавіць электрычныя батарэі-абагравальнікі ў кабінетах. Адным словам, працаваць гэтай зімой будзе максімальна камфортна. Ну і той факт, што кабінеты стануць утульнымі, светлымі, прыгожымі, дабаўляе настрою і жадання працаваць.

— Наш сенатар — гэта наша самая хуткая дапамога, — гаворыць **урач Таццяна ЛАЎРЭНКА**. — У склад Парахонскай участковай бальніцы ўваходзяць яшчэ паліклініка і чатыры ФАПы. Калі нешта тэрмінова патрабуецца для любой з медустаноў, звяртаюся да Уладзіміра Фёдаравіча. І ніколі не было адмовы. Некалькі гадоў таму з дапамогай гаспадаркі памянялі падлогу ў паліклініцы. Не так даўно ў якасці спонсарскай дапамогі сельгаспрадпрыемства набыло сучасны мікраскоп для лабараторыі. Падчас пандэміі мы мелі ўсё неабходнае дзякуючы менавіта нашым спонсарам. Ды і любы бягучы рамонт не абыходзіўся без іх дапамогі. Сведчанні сацыяльнай накіраванасці палітыкі буйнога сельгаспрадпрыемства і сенатарскага клопату — цяперашні рамонт Беразцоўскага ФАПа.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Беразцоўскага ФАПа.**